


# ПАСЛУХАЙ ЖАНЧЫНУ...

## І ЗРАБІ, ЯК ЯНА СКАЗАЛА

Было гэта даўно, гадоў 70 таму, калі ў нас існаваў прыход: гэта значыць, што людзі з розных вёсак у пэўныя святы адно да аднаго хадзілі ў госці.

Якраз тады на Вадохрышча ў Лельчыцы прыйшоў хлопец з Ліплян. Людзі ўбачылі яго і жахнуліся: на твары на ўсю шчаку вялізная чырвоная пляма. «Што зрабілася? Адкуль?!» — сталі распытваць.

Хлусіць у такое свята нельга было, ён праўду расказаў:

— Вось-тось-то, браточкі (гэта ў Ліплянах прыслоўе такое)! Хто з вас ведае Гладышку? Ага... Дык ён жа родны мой бацька. Упарты чалавек: калі нешта ўдумае, па-свойму зробіць!

Дык во: на пачатку снежня прыходзіць да нас яго прыяцель, кажа, што чакае гасцей — просіць гарэлкі выгнаць, бо «казёнкі» на ўсіх не набярэшся... Абяцае і заплаціць як след, і нам на гонку мукі прывезці.

Тату — ды перад Калядамі — захацелася першачка, свежачка... Вось ён і згадзіўся.

У нядзелю той чалавек прывёз нам цукар, муку (з ёй тады цяжка было, бо ўсе трымалі жывёлу). Бацька тут жа намыў бульбы — паставіў ля парога, каб падмерзла (ведаў, што з такой во, патоўчанай, брага лепей будзе «хадзіць»).

А маці тым часам давай сварыцца на яго: казаць, што адзін дурань у нядзелю нешта з хаты вывез, а другі — ні рубля не заплаціўшы — узяў... Што нельга так рабіць — дрэнная прыкмета.

Бацька не слухаў яе — моды такой не меў.

Назаўтра маме загадаў рошчыну зрабіць з мукі прарошчага жыта, каб у брагу ўкінуць — замест драўжджэй.

Мама нават не падумала: сказала, што ў панядзелак нельга пачынаць ніякіх спраў.

Тата зноўку вухам не павёў — абыйшоўся без яе: сам зрабіў тую рошчыну.

К вечару мы закалацілі брагу, бочку з ёй схавалі за печ і накрылі коўдрай.

Мусіць, праўду кажуць, што калі ў хаце згоды няма, брага будзе бурчаць і пеніцца. Наша тады — аж вечка падымала, з бочкі «выскаквала»...

Але ж вось дачакаліся: і яна «адхадзіла», і да самагоннага апарата чарга падышла. Можна гнаць, але зноў жа... у панядзелак.

Тут, бачу, ужо і бацька завагаўся. Ды чарга ёсць чарга: па новай займаць не хочацца.

...Значыць, мы ў панядзелак злілі сваю брагу ў бітоны, пагрузілі на саматужкі. Цямком, таемныя сцежкамі завезлі да апарата і ўжо там залілі ў бражнік, пад кацёл падлажылі дроў.

Я добрых назапасіў. І загадзя... А тады — нашу́-нашу́, бацька падкідае... Кажу, мо досыць? Ён (*з форсам!*): «Яйкі курэй не вучаць».

Бражнік тым часам ледзь не ходарам ходзіць, буркоча — вось-вось, здаецца, першачок пацячэ...

Мы бліжэй — каб убачыць, а затычка адтуль як ірване... Брага следам — фантанам!

Мы вобзем, тварамі ў снег, а яна, чуем, зверху на нас лёп-лёп, лёп-лёп... І пячэцца — аж вочы на лоб! Мне во таксама перапала...

Пахапалі мы пустыя бітоны ды лётам дамоў. Мама дзверы адчыніла, — і мову адняло: давай ратаваць.

...На добры толк нам абодвум трэба было да доктара, у бальніцу, але ж адтуль у міліцыю пазванілі б.

А там недурныя людзі працуюць: мігам здагадаліся б, дзе мы так пацярпелі і штрафу такога ўлупілі б, што карову прыйшлося б прадаць!

Мы самі лячыліся: халоднае да сябе прыкладалі. І ўсё роўна было не пазнаць: Тата самакрутку не мог скруціць (вочы зусім заплылі). І суп яму ў кубак налівалі.

Я таксама не «прыгажэйшы» быў.

Два тыдні ў хаце сядзелі, каб людзей не палохаць, — як бы ў водпуску за свой кошт.

Карацей — ні здароўя, ні работы, ні самагонкі, ні грошай... Яшчэ і ў даўгах!

Вось тось-то, браточкі! Трэба гаспадынь сваіх слухаць. Яны ведаюць, што гавораць.

**Запісаў А. Маскалевіч,**
*г. Лельчыцы.*

# КУПІ — ПРАДАМ,

## альбо І АДНО НЕ МЁД, І ДРУГОЕ НЕ РЭДЗЬКА

*...Зазірнуўшы гэтым летам*
*У вясковы магазін,*
*Выпадкова*
*стаў я сведкам*
*Шчырай гутаркі жанчын:*
*Прадавачкі ля вітрыны*
*Спавядаліся нібы...*
*Я ж у памяці пакінуў*
*Словы іхняе жальбы.*
*— Во часы...*
*— Вы не кажыце...*
*Шмат тавару... І не збыць:*
*Нібы той валун пры жыце,*
*На паліцах ён ляжыць.*
*Ходзяць людзі, пазіраюць —*
*Кашалькі — не дастаюць:*
*Можа, грошай мала маюць?*
*Мо на смак не дабяруць?*
*— І мяне дырэктар зоны*
*Кожны дзень грызе жыўцом:*
*Не сядзі, маўляў, варонай,*
*Раз працуеш прадаўцом.*
*А то больш*
*трымаць не будзем...*
*Дай рэкламу на тавар:*
*Пакажы*
*вясковым людзям*
*І не спіну,*
*а свой твар...*
*Я «намёкі» зразумела:*
*Ну чаму б і сапраўды,*
*Не ўзяцца мне за дзела,*
*Не чакаючы бяды?*
*Чула —*
*пенсію ў аўторак*
*Паштальёнка раздала...*
*Я ўміг «рэкламны ролік»*
*На ўсю краму завяла.*
*— Ой, Міхайлаўна, заходзьце!*
*Што вы хочаце купіць?*
*Сын прыедзе заўтра ў госці?*
*Нешта выпіць-закусіць?*
*Каньячку тады вазьміце —*
*Моцна ж любіце сынка?*
*Вось яму і дакажыце:*
*На закуску —*
*балычка...*
*— Не? Вы кажаце, не трэба?*
*Лепш бутэлечку віна,*
*Дзве кансервы, бохан хлеба,*
*Раз кусліва цана?*
*...Усё злажыла:*
*на і тэпай*
*(З гэтым выканаеш план?)*
*Але ж вунь*
*паўзе «аскепак»...*
*— Як здароўечка, Сцяпан?*
*Яшчэ крэгаеш пацііху?*
*А што купіш? Пакурыць?*
*Дык не «Фэст»,*
*бо гэта ж ліха,*
*«Монтэ-Карлу» лепш бяры!*
*Як зацягнешся, кабеты*
*Побач будуць — тут як тут...*
*(Ён купіў?*
*Чакайце...*
*Дзе там!*
*Найтаннейшы ўзяў тытунь!)*
*А вось Сонеччыны дзеўкі:*
*Гэтых, можа, угавару?*
*— Вой красуні!.. Вой паненкі!*
*Як жа выраслі ўгару!*
*Мо памерaеце плацці!*
*У такіх — хоць пад вянец!*
*І нядорага —*
*купляйце —*
*Хлопцы ўбачаць*
*і канец...*
*Што?*
*Такія ўжо не ў модзе*
*Мне сабе ў шафу ўзяць?*
*Але ў ёй і так па годзе:*
*Дзверцы цяжка зачыняць!*
*...Дзень цалюткі*
*лапатала —*
*Забалеў ажно язык!*
*А вось толку —*
*толку мала:*
*У касе зноў вялікі пшык.*
*Гэй, калегі, памажыце —*
*Завяду ў рэстаран:*
*Хто мудрэйшы,*
*падкажыце,*
*Як жа выканаць*
*той план?*

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*



Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** і Ніла Гілевіча мудрае:

*Ці мала што*
*ў жыцці бывае!*
*Якіх вузлоў не вяжа лёс!*
*Няшчасны той,*
*хто ўсё прымае*
*Да сэрца блізка і ўсур'ёз.*

А з гумарам яно ж хоць трохі ды лягчэй. Ці не так?



Неасабісты суб'ектыў

# БЕДНАЯ МАДАМ ІВЭТ...

## Пра адкрыццё Алімпіяды і не толькі

ПАСЛУЖЛІВЫ тэлефон, які больш жыве тваім жыццём, чым ты сам, а ўжо ведае пра яго дык дакладна больш, прычым у разы, пікнуў і напісаў на экране: «Прыгадайце, што вы рабілі ў гэты дзень пяць гадоў таму». І паслужліва пад прыемную музыку пачаў гартаць фотаздымкі канца ліпеня такога блізкага і такога ўжо далёкага (калі падумаць: колькі ўсяго за гэтыя пяць гадоў адбылося!) 2019-га. Здавалася, проста ў мінскую кватэру ўварваўся пах нагрэтай лаванды і хвоі — водар Праванса, на фота было высокае неба, гатычныя шпілі, высокія горы і зялёныя пагоркі, шыкоўныя, нябачаныя нідзе кветкі. На фота было мінулае жыццё, якое ўжо не верыцца, што было, бо ў параўнанні з тым, што робіцца цяпер, яно здаецца абсалютна нерэальным. Літаральна праз некалькі месяцаў накрыла ковіднае вар'яцтва, а пасля пачало ўсё закручвацца па шалёнай фантасмагарычнай спіралі, і гэткай «вішанькай» на абсалютна неядомым торце стала (прынамсі на сённяшні дзень) пародыя на «Тайную вячэру» на адкрыцці Алімпіяды, ад якой здрыгануўся, мне здаецца, кожны адэкватны чалавек...

У тым, іншым жыцці, тры тыдні ўдалося пажыць у Францыі навват не ў якасці турыста, якому паказваюць толькі ўсе цікавосткі і сувенірныя крамы. Мы жылі хутчэй як звычайныя месцічы: хадзілі за прадуктамі ў крамы, таргаваліся на рынках, камунікавалі з суседзямі — месье Ларан, які займаўся вырошчваннем клубніц, амаль кожную раніцу прыносіў нам свежыя ягады і за гэта не ўзяў ні цэнта. Затое быў удзячны, калі налівалі яму кавы, і вельмі любіў пагаварыць пра што заўгодна: пра надвор'е, пра цэны, пра палітыку. Асабліва яго хвалявалі gilets jaunes — «жоўтыя жылеты», якія былі недзе там, далёка, у Парыжы, але ад дзеянняў якіх наўпрост залежала магчымасць месье Ларана з невялікага гарадка на поўдні краіны прадаць свае ягады па нармальнай цане. Ён скрушна ківаў галавой, разважаў, што калі «жылеты» не супакояцца, увесь яго бізнес можа пацярпець крах... На рынку дыні, якія ў тым клімаце растуць, як у нас бульба, прадавалі па два еўра за штуку (у нас такія невялічкія называюцца «калгасніцы»). «Дорага», — казалі мы, спрабуючы збіць цану. «Les gilets jaunes», — разводзілі рукамі прадаўцы. Такое ўражанне, што на ўсе беды і праблемы ва ўсіх быў толькі адзін адказ.

АЛЕ тут прыйшла новая навала — пажары. Гэта ў месцы, дзе пад нагамі тоўстая і вельмі сухая падсцілка з хвойных іголак, над галавой шумяць сухія ж сасновыя шаты, а тэмпература паветра плюс сорак чатыры, — з'ява страшная, скажу я вам. Асабліва калі жывеш на тамтэйшым хутары, да бліжэйшых суседзяў кіламетры два, усё наваколле зацягнутае духмяным дымам, і ты нават чуеш, як дзесьці далёка трашчыць полымя. А машыны няма, і ты ўжо прыкідваеш, куды ў тым перадгор'і Альпаў пабяжыш, калі што... Агонь бушаваў у Манпелье, да нас ён не дабраўся, але радасці было мала. Калі б раптам што здарылася — наўрад ці даехалі б да адзінокага доміка ў гарах пажарныя... Месье Ларан расказваў пасля, што недзе там яны сапраўды не даехалі, але не таму, што далёка, а таму што (не смейцеся!) gilets jaunes — ужо мясцовыя, перакрылі рух на дарозе.

У маленькіх правансkіх гарадках вуліцы віравалі ад шматлікіх турыстаў — у Авіньёне якраз праходзіў міжнародны тэатральны фестываль. Была магчымасць паназіраць збоку, як тыя ж самыя турысты шукаюць менавіта мясцовы каларыт — купляюць лавандавае мыла і лыжкі для салаты, выразаныя з алівы, з задавальненнем фатаграфуюцца з прыгожымі і вельмі жаноцкімі мясцовымі жыхаркамі — я не бачыла там ніводнай францужанкі ў джынсах — усе ў зграбных сукенках (дробныя кветачкі на тканіне — абавязковы атрыбут), у акуратным абутку на абцасіках, у капялюшыках. Было відаць, што гэта для іх натуральна, што яны так насамрэч жывуць. І пабач з імі — мужчыны, ніяк інакш...

ШТО можа быць інакш, нам расказала мадам Івэт, у якой мы на некалькі дзён спыніліся ў нашым падарожжы, ужо накіроўваючыся на поўнач, дзесьці пад Дзіжонам. Агледзеўшы гасцей — сям'ю маіх сяброў з дваімі дзецьмі і вашу пакорную слугу, яна спытала, як мы жадаем размясціцца ў пакоях і ці жадае мадам (я, значыць) асобныя апартаменты. На наша здзіўленае «а як інакш?» гаспадыня аж прасвятлела тварам. «А, дык у вас усё традыцыйна», — з палёгкай уздыхнула яна. І пасля, калі седзячы за снеданкам ці за вячэрай мы размаўлялі на розныя тэмы, мадам Івэт скрушна ўздыхала пра былыя часы, калі ўсё было «як напісана ў Бібліі». Жанчына была шчырай каталічкай, і яе, больш чым gilets jaunes, хвалявала ўзаконенасць нетрадыцыйных адносін (тады гэты дурдом толькі пачынаўся), а чуткі, што ў мясцовым храме хутка будзе адпраўляць набажэнствы жанчына, мадам пераказвала нам шэптам, з вачыма, поўнымі жаху...

ПЯЦЬ гадоў таму нам яшчэ пашанцавала ўбачыць Еўропу ў нармальным выглядзе (gilets jaunes гэта былі так, кветачкі), праўда, пра гэта мы нават не здагадваліся. Я зразумела гэта летась, калі давялося трапіць у іншую еўрапейскую сталіцу, у якой не раз была ў даковідныя часы. Шмат што змянілася — напрыклад, паўпустыя магазіны, якія так і не акрыялі пасля вымушанага лакдаўну. Але ўразіла больш не гэта (прытым, што я абсалютна не ханжа), а вялікая колькасць людзей, якія, мякка кажучы, знаходзяцца ў пошуку ўласнага гендара. Прычым паводзяць яны сябе нават нахабна — два мужыкі цалуюцца ў метро (выбачайце за натуралізм) і назіраюць за рэакцыяй навакольных. І таму, хто паглядзіць неяк не так, я б не пазайздросціла. Пытаюся ў школьніка, як справы, як настаўнікі, і ён мне нават з гумарам расказвае, што ў класе ў яго выкладае «яно» — па фізіялогіі, здаецца, мужчына, бо барада, але ходзіць з макіяжам і ў спадніцы, не адносіць сябе ні да жанчын, ні да мужчын, бо «яно» ніяк не можа вызначыцца. А ў падручніку другакласніка намаляваны варыянты «сям'і», дзе два таты і дзве мамы...

ТАМУ я зусім нават не здзівілася, калі ўбачыла гэты кашмар на адкрыцці Алімпіяды. Толькі чамусьці адразу падумала: «Бедная мадам Івэт»...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**